Гісторыя без «белых плям»

# Рэабілітаваць (пасмяротна)...

**4 сакавіка 1938 года Васілю Фамічу Шаранговічу споўніўся 41 год. Адкрыты і эмацыянальны, ён лёгка заводзіў сяброў, любіў збіраць вакол сябе таварышаў, і звычайна яго дзень нараджэння праходзіў весела, з жартамі, розыгрышамі...**

**— Падсудны Шаранговіч, вы пацвярджаеце вашы паказанні, дадзеныя на папярэднім следстве!**

**— Поўнасцю пацвярджаю. Дазвольце мне ўсё расказаць паслядоўна. Здраднікам радзімы я стаў у жніўні 1921 года і быў ім да арышту...**

**Гэта быў не розыгрыш. З такога дыялога 4 сакавіка 1938 года ў Маскве пачалося ранішняе пасяджэнне на адкрытым судовым працэсе антысавецкага праватрацкісцкага блока. На адгароджаных месцах Кастрычніцкай залы Дома саюзаў пад аховай канвою НКУС у ліку 21 падсуднага знаходзіўся і Васіль Фаміч Шаранговіч. І года не мінула з таго часу, калі ў такія ж сакавіцкія дні ён прымаў віншаванні з абраннем яго першым сакратаром ЦК Кампартыі (бальшавікоў) Беларусі...**

## «Вужакай чорнай вы паўзлі ў Булонскі лес»

З першага рада прэзідыума зала відаць, як на далоні, і Шаранговіч мог добра разгледзець усіх удзельнікаў пленума ЦК КП(б)Б. Многіх ён ведаў па ранейшай сумеснай рабоце— Чарвякова, Галадзеда, Убарэвіча, але некаторыя твары бачыў упершыню. І прычына была не толькі ў натуральным абнаўленні выбарнага органа. Ішла жорсткая чыстка партыйнага і дзяржаўнага апарату, шмат каму прыйшлося аддаць партбілеты. Прыбавілася работы органам НКУС. «Цяперашнія шкоднікі і дыверсанты, якім бы сцягам яны ні маскіраваліся, ператварыліся ў беспрынцыповую і безыдэйную банду прафесіянальных шкоднікаў, дыверсантаў, шпіёнаў, забойцаў. Зразумела, што гэтых паноў прыйдзецца граміць і карчаваць бязлітасна як ворагаў рабочага класа, як ворагаў нашай радзімы». Так два тыдні назад, на Пленуме ЦК ВКП(б), ставіў задачу Сталін — а задачы, якія ён ставіць, абавязкова выконваюцца. У што б там ні было.

Толькі паўгода назад, у жніўні 1936 года, прагрымеў адкрыты працэс па справе трацкісцка-зіноўеўскага тэрарыстычнага цэнтра: Зіноўеў, Каменеў, Еўдакімаў — усяго 16 чалавек, якія, як сцвярджалася, арганізавалі забойства Кірава, рыхтавалі замах на Сталіна, займаліся шпіянажам і дыверсіямі... І вось зноў, не паспела сціхнуць рэха тых расстрэлаў, 24 студзеня пачаўся новы адкрыты працэс — па справе Пятакова, Радэка і іншых.

*Вужакай чорнай вы паўзлі ў Булонскі лес.*
*Тапор вам Троцкі даў, што Троцкаму даў бес.*

Так пісаў паэт Андрэй Александровіч* у «Звяздзе» 29 студзеня. Наконт беса — містыкай папахвае, Александровічу як кандыдату ў члены ЦК КП(б)Б варта было б мацней трымацца матэрыялістычнай глебы. І ці няма перабольшвання сваёй ролі ў радках: «Я свой смяротны вам прыпісваю прысуд рукой і воляй беларускага народа»?

У вельмі складаны і адказны момант ён, Шаранговіч, вярнуўся ў Мінск. Барацьба абвастраецца. Толькі што Пленум ЦК ВКП(б) выключыў з партыі Бухарына і Рыкава. Асабіста знаёмым з імі ён не быў, але абодвух не раз мог бачыць і слухаць на з'ездах партыі і ўсесаюзных партканферэнцыях...

Пленум ЦК КП(б)Б аднадушна адобрыў гэта рашэнне. Яшчэ на парадку дня — выбары. На пасаду першага сакратара рэкамендавана кандыдатура Шаранговіча. Усяго 18 гадоў Кампартыі рэспублікі, а ўжо колькі першых сакратароў ЦК памянялася, некаторыя і года не працавалі. Праўда, пяць гадоў запар быў першым Мікалай Фёдаравіч Гікала, яго папярэднік і, у пэўным сэнсе, настаўнік: чатыры гады Шаранговіч працаваў разам з ім на пасадзе другога сакратара, да свайго назначэння ўпаўнаважаным Камісіі парткантролю ЦК ВКП(б) у Харкаў. Праводзілі Гікалу на новую работу у той самы Харкаў урачыста, да самай граніцы з Украінай.

Хацелася б прадоўжыць пачатую ім традыцыю — папрацаваць пабольш. Выпадала Шаранговічу працаваць і ў Сібіры, і ў Казахстане (там і ажаніўся), але ўвесь час цягнула на радзіму. З жонкай не раз гаварыў пра сваю мару — аб'яднанні ўсёй Беларусі, вызваленні землякоў ад польскіх паноў...

Яго родная вёска Качаны заставалася на тым баку, пад Польшчай. Шаранговіч адчуваў амаль фізічны боль, калі ўспамінаў жорсткія катаванні, праз якія яму прыйшлося прайсці ў польскіх турмах. Восенню 1919 года ён атрымаў заданне перайсці лінію фронта і на акупіраванай тэрыторыі Беларусі пачаць арганізацыю партызанскай барацьбы супраць белапольскіх інтэрвентаў. Пад псеўданімам Лютовіча ён праводзіў сходы партызан, кіраваў аперацыямі, узнімаў людзей на барацьбу. Белапалякі кінулі супраць мсціўцаў кадравыя часці. Група байцоў, у тым ліку і Шаранговіч, былі схоплены карнікамі. Расстрэл, да якога прыгаварылі падпольшчыка, замянілі 20 гадамі зняволення. Але гэта ўсё роўна, што смерць, — пасля катавання цела амаль не слухалася.

У 1921 годзе, праз 18 месяцаў пасля арышту, ён быў абменены Савецкім урадам і вярнуўся ў Беларусь. Яму ўручылі вышэйшую ўзнагароду рэспублікі — ордэн Чырвонага Сцяга і ганаровую зброю...

Хто мог падумаць, што прыйдзе час, калі гэта старонка біяграфіі Шаранговіча ляжа ў аснову другога ў яго жыцці прысуду — расстрэлу? Але хто тады, у 1921 годзе, мог уявіць, што праз тры гады не стане Леніна, а чалавек, які заменіць яго на чале партыі, сканцэнтраваўшы ў сваіх руках непамерную ўладу, разам з памочнікамі паставіць справу так, што многія камуністы, якіх не зламалі царская катарга, панскія турмы, будуць каяцца ў прыпісаных ім грахах і паклёпнічаць на незнаёмых людзей, на блізкіх таварышаў, на саміх сябе?..

**Са стэнаграмы працэсу «антысавецкага праватрацкісцкага блока»:**

**ВЫШЫНСКІ. Падсудны Бухарын, вы прызнаяце сябе вінаватым у шпіянажы?**
**БУХАРЫН. Я не прызнаю.**
**ВЫШЫНСКІ. У вас была група вашых саўдзельнікаў, змоўшчыкаў з Беларусі, узначальваемая Галадзедам, Чарвяковым, Шаранговічам. Правільна, Шаранговіч?**
**ШАРАНГОВІЧ. Правільна.**
**ВЫШЫНСКІ. І па дырэктыве Бухарына і Рыкава, пад іх кіраўніцтвам вы звязаліся з польскай разведкай і польскім генштабам? Правільна, Шаранговіч?**
**ШАРАНГОВІЧ. Зусім правільна.**
**ВЫШЫНСКІ. Значыць, хто быў арганізатарам шпіянажу, якім вы займаліся?**
**ШАРАНГОВІЧ. Рыкаў, Бухарын.**
**ВЫШЫНСКІ. Значыць, яны былі шпіёнамі, гэтак жа, як...**
**ШАРАНГОВІЧ. Як і я сам.**

Але да гэтага, адрэпеціраванага ў падвалах НКУС дыялога заставаўся яшчэ год. 18 сакавіка 1937 года Васіль Фаміч Шаранговіч быў уведзены ў члены бюро і абраны першым сакратаром ЦК КП(б)Б. З гэтага моманту ён нёс адказнасць за ўсё, што адбывалася ў рэспубліцы — добрае і дрэннае. Чалавек не выбірае свой час. Шаранговічу выпаў 1937 год. Кажуць, што стыль — гэта чалавек. Стыль Шаранговіча як работніка сфарміраваўся ў 20-я гады, калі на адказных пасадах ў наркамаце юстыцыі, Беларускім савеце прафсаюзаў даводзілася пастаянна сустракацца з людзьмі, дапамагаць ім. І на пасадзе кіраўніка рэспубліканскай партарганізацыі Шаранговіч па-ранейшаму заставаўся даступным, шмат ездзіў, мог заначаваць у любой вясковай хаце...

Такі стыль работы не адпавядаў высокаму ўзору. Сталін у 30-я гады практычна перастаў выязджаць на сустрэчы з калгаснікамі, рабочымі — рашэнні прымаліся, не выходзячы з кабінета. Але кабінетна-дыктатарскі стыль прымаўся далёка не ўсімі, нават калі яны не выступалі адкрыта супраць сталінскіх установак — Кіраў, Арджанікідзе, Рудзутак...

Свядома, падсвядома, але супраціўленне адміністрацыйна-каманднай сістэме ніколі поўнасцю не знікала ў партыі, у народзе. І рэпрэсіі былі апошнім сродкам яго падаўлення. Пасля арышту Шаранговічу паставяць у віну, што ў час паездак па рэспубліцы ён не выкрываў ворагаў.

Так, стыль работы мог вызначыць лёс чалавека.

## «Усіх трацкістаў корні знішчым»

20 сакавіка 1937 года, на другі дзень работы Шаранговіча першым сакратаром ЦК КП(б)Б, газета «Праўда» апублікавала рэдакцыйны артыкул «Шкодная пісаніна», у якім рэзка крытыкавала цэнтральны орган Кампартыі Беларусі — газету «Звязда». Калісьці адным з першых партыйных даручэнняў Шаранговіча быў збор грошай на выданне гэтай адзінай тады ў Беларусі бальшавіцкай газеты. І вось зараз першае бюро, якое ён правадзіў пасля выбрання, было прысвечана «Звяздзе».

Як паклёпніцкі кваліфікаваўся выраз з перадавога артыкула за 8 лютага: «Нанесен сур'ёзны ўдар расхлябанасці і падхалімству, народжаным спецыфічнымі ўмовамі жыцця беларускага і яўрэйскага народаў у мінулым, местачковасцю». «Праўда» пісала: «Такую тэорыю Юркоў мог запазычыць толькі ў Бухарына. Рэдактар «Звязды» скажае ленінска-сталінскую нацыянальную палітыку. Гэты артыкул — шкодная пісаніна, якая можа нанесці сур'ёзны ўрон практычнай рабоце беларускай партыйнай арганізацыі».

Пасля падобных абвінавачванняў у 1937-м з выбарам мер не цырымоніліся. А калі ўлічыць уплывовасць органа, ад якога зыходзіла крытыка, дык лёс рэдактара «Звязды» быў фактычна прадвызначаны. Да таго ж, новы сакратар мог адразу прадэманстраваць цвёрдасць і прынцыповасць.

І ён прадэманстраваў іх: «Указаць тав. Юркову і папярэдзіць, што ў выпадку паўтарэння палітычных памылак да яго будуць ужыты суровыя меры партыйнага спагнання». Подпіс — сакратар ЦК КП(б)Б В. Шаранговіч...

І такія меры — у час, калі ворагаў выкрывалі, як спявалася ў прыпеўках, нават паміж пацалункамі?

*Мяне мілы правадзіў*
*Да зялёненькіх рабін.*
*Усіх трацкістаў корні знішчым,*
*Не астанецца ні адзін!*

* А. Александровіч быў арыштаваны ў 1938 годзе, да 1955 знаходзіўся ў ссылцы. Рэабілітаваны.

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы